Андрэй Аляксеевіч Раўкоў

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Андрэ́й Аляксе́евіч Раўко́ў (нар. 25 чэрвеня 1967, в. Равякі, Бешанковіцкі раён, Віцебская вобласць) — беларускі военачальнік, генерал-лейтэнант (2015). Міністр абароны Рэспублікі Беларусь у 2014—2020 гадах. Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь (2020).

Біяграфія

У 1984 годзе скончыў Мінскае суворaўскае ваеннае вучылішча, у 1988 годзе з адзнакай і залатым медалём — Маскоўскае вышэйшае агульнавайсковае камандное вучылішча, у 1999 годзе з адзнакай і залатым медалём — камандна-штабны факультэт Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, у 2005 годзе з адзнакай — ваенную акадэмію Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі.

З 1988 па 1997 гады прайшоў усе службовыя ступені ад камандзіра ўзвода да камандзіра батальёна.

З 1999 па 2003 гады ваенную службу праходзіў на пасадах начальніка штаба і камандзіра базы захоўвання ўзбраення і тэхнікі.

З 2005 па 2012 гады займаў пасады камандзіра асобнай мабільнай брыгады, начальніка аператыўнага аддзела — намесніка начальніка штаба аператыўнага камандавання, начальніка штаба — першага намесніка камандуючага войскамі аператыўнага камандавання.

З лістапада 2012 года па лістапад 2014 года — камандуючы войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання.

16 кастрычніка 2015 года пастановай Савета Міністраў № 870 у складзе Урада склаў свае паўнамоцтвы перад нававыбраным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь[1], а 17 снежня 2015 года ўказам Прэзідэнта № 500 зноў зацверджаны на пасадзе міністра[2].

Андрэй Аляксеевіч Раўкоў



8-ы Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь

20 студзеня 2020 — 3 верасня 2020

Прэзідэнт	Аляксандр Лукашэнка
Кіраўнік урада	Сяргей Румас Раман Галоўчанка
Папярэднік	Станіслаў Зась
Пераемнік	Валерый Вакульчык

8-ы Міністр абароны Беларусі

27 лістапада 2014 — 20 студзеня 2020

Прэзідэнт	Аляксандр Лукашэнка
Кіраўнік урада	Міхаіл Мясніковіч Андрэй Кабякоў Сяргей Румас
Папярэднік	Юрый Жадобін
Пераемнік	Віктар Хрэнін

У 2014 годзе па 26-й Лядзішчанскай акрузе быў абраны дэпутатам Мінскага абласнога савета дэпутатаў ад горада Барысава.

20 студзеня 2020 года прызначаны Дзяржаўным сакратаром Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь[3].

3 верасня 2020 года вызвалены ад пасады Дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь[4].

19 лістапада 2020 года прызначаны амбасадарам Беларусі ў Азербайджане[5].

Міжнародныя санкцыі

31 жніўня 2020 года Раўкоў быў уключаны ў спіс асоб, на якіх накладзена бестэрміновая забарона на ўезд у Латвію, пяцігадовая забарона на ўезд у Эстонію і забарона на ўезд у Літву ў сувязі з тым, што *«сваімі дзеяннямі ён арганізаваў і падтрымаў фальсіфікацыю прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня і наступнае гвалтоўнае здушэнне мірных пратэстаў»*[6]. 6 лістапада 2020 года Раўкова дадалі ў Чорны спіс Еўрасаюза[7]. Пры абгрунтаванні ўвядзення санкцый адзначалася, што ён як Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі, які цесна звязаны з Аляксандрам Лукашэнкам, нясе адказнасць за кампанію рэпрэсій і запалохвання дзяржаўнага апарату ў выніку прэзідэнцкіх выбараў, у прыватнасці, адвольныя арышты і жорсткае абыходжанне, у тым ліку катаванні, мірных дэманстрантаў, а таксама запалохванне і гвалт у дачыненні да журналістаў[8].

24 лістапада 2020 года да санкцый ЕС далучыліся Албанія, Ісландыя, Ліхтэнштэйн, Нарвегія, Паўночная Македонія, Чарнагорыя[9], а 11 снежня — і Швейцарыя[10]. Акрамя таго, 6 лістапада Раўкоў трапіў пад санкцыі Вялікабрытаніі[11] і Канады[12].

Нараджэнне	25 чэрвеня 1967 (56 гадоў) Равякі, Соржыцкі сельсавет, Бешанковіцкі раён, Віцебская вобласць, БССР, СССР
Партыя	беспартыйны
Адукацыя	Ваенная акадэмія Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі МінСВУ Маскоўскае вышэйшае ваеннае каманднае вучылішча ВАРБ
Дзейнасць	дзяржаўны дзеяч, ваенны
Ваенная служба	
Прыналежнасць	СССР Беларусь
Род войскаў	Узброеныя Сілы СССР
Званне	
Камандаваў	Паўночна-заходнім аператыўным камандаваннем, Міністэрствам абароны Беларусі
Узнагароды	
Медыяфайлы на Вікісховішчы	

Воінскія званні

- Палкоўнік (26 мая 2004).
- Генерал-маёр (22 лютага 2011)[13].
- Генерал-лейтэнант (7 мая 2015)[14].

Зноскі

1. Архіўная копія (http://government.by/upload/docs/filed13774f25432683d.PDF) (руск.) (недаступная спасылка). Архівавана (https://web.archive.org/web/20160304100850/http://government.by/upload/do

cs/filed13774f25432683d.PDF) з першакрыніцы 4 сакавіка 2016. Праверана 17 кастрычніка 2015.
2. Назначаны члены ўрада Рэспублікі Беларусь (http://president.gov.by/by/news_by/view/naznachany-chleny-urada-respubliki-belarus-12747/). http://president.gov.by+(17 снежня 2015).
3. Раўкоў прызначаны дзяржсакратаром Рады бяспекі (https://nn.by/?c=ar&i=244684)
4. Указ Президента Республики Беларусь от 3 сентября 2020 года № 328 «Об А.А.Равкове» (https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=P32000328&p1=1&p5=0)(недаступная спасылка). pravo.by (4 верасня 2020). Архівавана (https://web.archive.org/web/20220107073022/https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=P32000328&p1=1&p5=0) з першакрыніцы 7 студзеня 2022. Праверана 5 верасня 2020.
5. Равков — новый посол Беларуси в Азербайджане (http://interfax.az/view/820118)
6. Латвія, Літва і Эстонія ўключылі Лукашэнку і яшчэ 29 чыноўнікаў ў спіс пэрсон нон-грата. Поўны сьпіс (https://www.svaboda.org/a/30812996.html). *Беларуская служба Радыё «Свабода»* (31 жніўня 2020). Праверана 8 верасня 2021.
7. Евросоюз ввел санкции против Лукашенко и ряда белорусских чиновников (https://naviny.online/new/20201106/1604675539-evrosoyuz-vvel-sankcii-protiv-lukashenko-i-ryada-belorusskih-chinovnikov) (руск.)(недаступная спасылка). naviny.by (6 лістапада 2020). Архівавана (https://web.archive.org/web/20210407154706/https://naviny.online/new/20201106/1604675539-evrosoyuz-vvel-sankcii-protiv-lukashenko-i-ryada-belorusskih-chinovnikov) з першакрыніцы 7 красавіка 2021. Праверана 9 верасня 2021.
8. Consolidated text: Council Decision 2012/642/CFSP of 15 October 2012 concerning restrictive measures in view of the situation in Belarus (https://eur-lex.europa.eu/legal-content/EN/TXT/?uri=CELEX%3A02012D0642-20210621) (англ.). EUR-Lex.
9. Declaration by the High Representative on behalf of the EU on the alignment of certain countries concerning restrictive measures against Belarus (https://www.consilium.europa.eu/en/press/press-releases/2020/11/24/declaration-by-the-high-representative-on-behalf-of-the-eu-on-the-alignment-of-certain-countries-concerning-restrictive-measures-against-belarus/) (англ.). Савет Еўрапейскага саюза (24 лістапада 2020). Праверана 8 верасня 2021.
10. Belarus: Federal Council extends scope of sanctions (https://www.admin.ch/gov/en/start/documentation/media-releases.msg-id-81590.html) (англ.). Федэральны савет Швейцарыі (11 снежня 2020). Праверана 6 верасня 2021.
11. Consolidated List of Financial Sanctions Targets in the UK (https://assets.publishing.service.gov.uk/government/uploads/system/uploads/attachment_data/file/1010452/Belarus.pdf) (англ.). Урад Вялікабрытаніі. Праверана 8 верасня 2021.
12. Belarus sanctions (https://www.canada.ca/en/global-affairs/news/2020/11/belarus-sanctions.html) (англ.). Урад Канады (6 лістапада 2020). Праверана 8 верасня 2021.
13. Указ Президента Республики Беларусь от 22 февраля 2011 года № 62 «О присвоении А. А. Равкову воинского звания» (https://www.pravo.by/pdf/2011-24/2011-24(007-010).pdf)
14. Указ Президента Республики Беларусь от 26 мая 2004 года № 253 «О присвоении воинских и специальных званий» (http://laws.newsby.org/documents/ukazp/pos02/ukaz02543.htm)

Спасылкі

- Міністрам абароны прызначаны беларус Андрэй Раўкоў (http://nn.by/?c=ar&i=139481)
- Пяць фактаў пра новага міністра абароны Андрэя Раўкова (http://nn.by/?c=ar&i=139503)

Міністры абароны Рэспублікі Беларусь [паказаць]

Дзяржаўныя сакратары Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь [паказаць]

Слоўнікі і энцыклапедыі	OpenSanctions (https://www.opensanctions.org/entities/Q18613590/)

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Андрэй_Аляксеевіч_Раўкоў&oldid=4142719"

-